ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Магілёўскага аблвыканкама
_____________ І.Г.Лашкевіч
«20» сакавіка 2023 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення гарадскіх, раённых алімпіяд па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

Дата правядзення: 29 сакавіка 2023 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 12.00.

## VIII клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Закончыце фармулёўку: двухскладовая стапа з націскам на першым складзе называецца ____________________.
2. Падлічыце, колькі марфем у прапанаваным слове: *дадумваць*. Адказ запішыце лічбай ___________.
3. Гэта адметнасць беларускай мовы ўвасоблена ў помніку, які знаходзіцца ў Полацку. Над скульптурай працаваў мастак і дызайнер Ігар Куржалаў. На помніку выбітыя радкі з верша народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна: "Ад Еўфрасінні, ад Скарыны, ад Полацка пачаўся свет". Якая адметнасць беларускай мовы ўвасоблена ў помніку?_________________________________.
4. Іншаземец падарожнічае па нашай роднай Беларусі. Дапамажы госцю апрануцца па-беларуску. Сярод прапанаваных слоў пакінь толькі назвы адзення, выпішы, што не адносіцца да гэтай тэматычнай групы: *кашуля, аблавуха, сукенка, спадніца, цабэрак, камізэлька, нагавіцы, пантофлі.*_______________________________________________________.
5. Ефрасіння Полацкая ў школах арганізавала перапіску кніг, шырокае іх распаўсюджванне. З якой мэтай яна займалася гэтай справай?_________________________________________________________

**Заданне 2. Пастаўце дзеясловы ў форме загаднага ладу адзіночнага і множнага ліку.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| Неазначальная форма дзеяслова | Форма загаднага ладу дзеясловаў | |
|---|---|---|
| | адзіночны лік | множны лік |
| Узор: спаць | *спі* | *спіце* |
| адмераць | | |
| біць | | |
| закасаць | | |
| спяваць | | |
| рэзаць | | |

**Заданне 3. У сказах замяніце падкрэсленыя словы ці выразы фразеалагізмамі, каб сэнс выказвання не змяніўся.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

Добрыя ўчынкі

Андрэй і Пеця – родныя браты. Андрэй быў старэйшы і часта **задаваўся**. Калі Пеця рыхтаваў урокі, то Андрэй звычайна гультаяваў. У вольны час любіў **падурэць**. Калі малодшы брат не рабіў так, як ён, то быў **не стрыманы на словы**.

Вечарам бацька прапанаваў дзецям палічыць свае добрыя справы за дзень і даў кожнаму маленькую скрыначку. А на стол палажыў жалуды. Па чарзе гаварылі хлопчыкі і за кожны добры ўчынак клалі ў скрыначку жолуд. Скрыначка Пеці была амаль поўная, а ў Андрэя жалудоў было **зусім мала**. Андрэй адразу **замаўчаў**, з павагай глянуў на брата і задумаўся…

*задаваўся*________________________________________________
*падурэць*_________________________________________________
*не стрыманы на словы* _____________________________________
*зусім мала*______________________________________________
*замаўчаў*_________________________________________________

**Заданне 4. Прачытайце словазлучэнні. Правільна ці памылкова ўтвораны прыналежныя прыметнікі ў словазлучэннях? Пастаўце адпаведныя знакі ў пустыя клеткі табліцы. Пры адказе “так” пастаўце знак “+”, пры адказе “не” – пастаўце “–”.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| ля Натальчынай хаціны | | бабрыны хвост | |
| Міхасёў твар | | дзядулін капялюш | |
| Вольчын бацька | | зайчын корм | |
| Валодзіны думкі | | братавы словы | |
| за дзедавым дубам | | Жэнін (дзяўчынка) сшытак | |

**Заданне 5. Папрацуйце перакладчыкамі. Перакладзіце на беларускую мову сказы з рускім словам «нет».**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | |
|---|---|
| *Нет* уверенности в том, что … | |
| *Нет* чтобы поднести тяжёлую сумку! | |
| В магазине *нет* этого диска. | |
| *Нет*, вы только подумайте! | |
| Её всё *нет и нет*. | |

**Заданне 6. Узнавіце схемы адносна тыпаў тэксту.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*
*(1 бал – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| | | | |
|---|---|---|---|
| пачатак дзеяння → | развіццё дзеяння → | заканчэнне дзеяння → | |
| уяўленне аб прадмеце → | → | адносіны да прадмета → | |
| → | доказ (аргументы) → | → | разважанне |

**Заданне 7. Разгледзьце ўважліва малюнак. Якому ўстойліваму выразу ён адпавядае? Складзіце невялікі тэкст, у якасці назвы запішыце ўзгаданы фразеалагізм.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*



______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

**Заданне 8. Устанавіце адпаведнасць паміж псеўданімам і сапраўдным прозвішчам пісьменніка. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэнняў літар і лічбаў (напрыклад: А1, Б2, В3, Г4, Д5).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ)*

| Псеўданім | Сапраўднае прозвішча |
|---|---|
| **А.** Янка Купала | **1.** Яўген Іванавіч Скурко |
| **Б.** Змітрок Бядуля | **2.** Самуіл Яфімавіч Плаўнік |
| **В.** Кузьма Чорны | **3.** Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч |
| **Г.** Максім Танк | **4.** Іван Дамінікавіч Луцэвіч |
| **Д.** Якуб Колас | **5.** Мікалай Карлавіч Раманоўскі |

**Адказ** А__, Б__, В__, Г__, Д__.

**Заданне 9. К. Чорны сказаў: "Дружба – вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць… Беражыце дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека…". Успомніце вывучаныя беларускамоўныя творы (або прачытаныя самастойна). Запішыце ў табліцу пяць, што адпавядаюць тэматыцы, якую акрэсліў К.Чорны ў выказванні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*
*(0,5 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| Аўтар | Назва твора |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 10. Вызначце вершаваны памер прыведзеных ніжэй радкоў. Назавіце аўтара і літаратурны твор, з якога ўзяты гэтыя радкі.**

*Максімальная колькасць балаў – 5*
*(1 бал – за правільна вызначанага аўтара, 1 бал – за правільна пазначаны твор, 3 балы – за правільна вызначаны памер ).*

Між алешын, кустоў,
Дзе пяе салавей,
І шуміць, і грыміць
Срэбразвонны ручэй.

**Аўтар твора____________________________**
**Назва твора ___________________________**
**Вершаваны памер твора ________________**